**ЗБО́РНІК**, 1) цэласная, завершаная па сваёй ідэйнай задуме кніга вершаў або апавяданняў, у якой размешчаны творы аднаго (аўтарскі З.) або некалькіх (калектыўны З.) аўтараў. Літ. З. падзяляюцца на *альманахі*, *анталогіі*, *хрэстаматыі*. На тэр. Беларусі З. вядомы з часоў сярэднявякоўя (Пралог, Чэцці-Мінеі, патэрыкі і інш.). У новай бел. л-ры аднымі з першых З. лічацца кнігі В.*Дуніна-Марцінкевіча* «Гапон», «Вечарніцы і Апантаны» (абодва 1855). 2) Вучэбны дапаможнік з задачамі і практыкаваннямі. *В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова